Беларусь.info

№12 17/03/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Дзяржпэпартамэнт ЗША адрэагаваў на выступ Сьцяпана Сухарэнкі.** "Гэтыя абуральныя выказваньні даюць зразумець, што беларускія ўлады схільныя да неапраўданага ўжыцьця сілы і гвалту супраць уласнага народу", -- сказана ў заяве Дзяржпэпартамэнту. "Мы заклікаем урад Беларусі выконваць свае абавязаньні па абароне правоў уласных грамадзянаў, у тым ліку права на свабоду сходаў і на мірнае выказваньне сваіх поглядаў. Любое ўжыцьцё сілы альбо гвалту супраць мірных дэманстрантаў выкліча рашучы адказ міжнароднай супольнасьці".

**У Гомелі і ў Ашмяне арыштаваныя актывісты абвясьцілі галадоўку.** У Гомелі малады актывіст дэмакратычнага руху Сяргей Сямёнаў абвясьціў галадоўку ў сьледчым ізалятары часовага ўтрыманьня. Распачаў галадоўку і арыштаваны ў Ашмяне актывіст Пётра Явідовіч.

**На плошчу Казулін і Мілінкевіч выйдуць разам.** 17 сакавіка абодва кандыдаты выступілі з агульнымі заявамі. Яны зьвярнуліся да ЦВК, праваахоўчых і судовых органаў з патрабаваннем захоўваць законнасць. У менскім кінатэатры адбылася агульная сустрэча з выбаршчыкамі.

**Усе студэнты, адлічаныя па палітычных матывах, змогуць працягнуць навучанне ў ВНУ замежных краін.** Адзіны кандыдат у прэзідэнты ад дэмакратычных сіл Аляксандр Мілінкевіч вядзе перамовы з урадамі і рэктарамі вядучых еўрапейскіх ВНУ, каб беларускія студэнты, адлічаныя за ўдзел у бягучай прэзідэнцкай кампаніі, мелі магчымасць працягнуць навучанне за межамі краіны. Акрамя таго, Аляксандр Мілінкевіч падкрэсліў, што пасля яго перамогі на прэзідэнцкіх выбарах незаконныя рашэнні аб адлічэнні студэнтаў будуць скасаваныя.

# Людзі

**Хаўер Салана абураны заявай беларускага МЗС у бок карінаў ЕС.** Салана нагадаў, што на ўладзе Беларусі "ляжыць поўная адказнасьць за забяспячэнне фундаментальных правоў і гарантый бяспекі беларускага народа". Высокі прадстаўнік ЕС таксама заўважыў што любы гвалт супраць дэманстрантаў будзе сустрэты жорсткай міжнароднай рэакцыяй.

# Абвесткі

**18 сакавіка на плошчы Бангалор адбудзецца канцэрт-сутсрэча з Мілінкевічам.** Мінгарвыканкам даў афіцыйны дазвол на вялікі канцэрт, які пачнецца ў 17:00 18-га сакавіка. На канцэрце выступяць знаныя беларускія гурты і праекты — N.R.M., Нейро Дзюбель, IQ-48, Партызанская школа. Магчымы ўдзел іншых камандаў.

**19 сакавіка святкуем перамогу разам на Кастрычніцкай плошчы ў Менску.** На плошчу прыйдуць абодва кандыдаты ў прэзідэнты — А. Казулін і А, Мілінкевіч. Бярыце з сабой кветкі і надзіманыя шарыкі. Будзе весела.